Запрашальнік

# «ПРЫАДЧЫНІЦЬ БОЖУЮ ВОЛЮ З ДАПАМОГАЙ КІНЕМАТОГРАФА»

**У Глыбокім працягваецца VII Міжнародны каталіцкі фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм «Magnificat»**

**АМАЛЬ сорак дакументальных і анімацыйных фільмаў запланавана да паказу на VII Міжнародным каталіцкім фестывалі «Magnificat-2011». Ужо другі год запар фестываль распачынаецца ў Мінску, асноўная ж яго частка праходзіць у Глыбокім, куды госці і ўдзельнікі фестывалю выправіліся ўжо ўчора.**

З кожным годам фестываль расце — і перш за ўсё дзякуючы новай геаграфіі стужак-удзельніц. Сёлета дэбют адбыўся ў ізраільскай стужкі. Увогуле за Гран-пры на сёлетнім фестывалі будуць змагацца стужкі з 13 краін свету: Арменіі, Беларусі, ЗША, Літвы, Ізраіля, Іспаніі, Італіі, Польшчы, Расіі, Славакіі, Украіны, Францыі і Чэхіі.

— Чарговы фестываль «Magnificat» павінен стаць яшчэ адным крокам да папулярызацыі хрысціянскіх каштоўнасцяў праз такую форму мастацтва, як кіно, тэлебачанне, інтэрнэт і іншыя СМІ. Вельмі радуе, што з года ў год развіваецца экуменічны напрамак фестывалю — гэта знак нашага часу, — адзначыў падчас адкрыцця фестывалю **Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.**

Лідарам па колькасці падрыхтаваных да паказу фільмаў на сёлетнім фестывалі стала Беларусь — 8 стужак. Крыху менш у Расіі і Польшчы — сем і шэсць адпаведна. Адразу чатыры фільмы прывезлі рэжысёры з Італіі.

**Рэжысёр Вольга ДАШУК (Беларусь):**

— З аднаго боку, «Magnificat» — гэта фестываль, з другога — гуманітарная акцыя. У многіх фільмах, якія я паспела паглядзець, асветніцкі пачатак часта дамінуе над мастацкай формай. Але гэта натуральна і лагічна. На фестывалі я прадстаўляю каротка-метражную стужку «Тры кіламетры да неба». Гісторыя пра хлопца Андрэя Мікалаева. Андрэй — асаблівы чалавек, які ў сілу фізічных магчымасцяў не можа жыць поўным жыццём. Але прыклад яго жыцця і жыцця яго жонкі сведчыць пра тое, што перашкоды — унутры нас саміх.

### «Паломнікі» — новы праект Аляксандра Купрына

**Расійскі рэжысёр Аляксандр Купрын на сёлетні фестываль прадставіў стужку «Ахвяры Бутаўскага палігона» (адзін з трыццаці фільмаў цыкла «Святыя»). Аднак жа большая частка яго планаў зараз звязана з рэалізацыяй іншага праекта — фільма «Паломнікі». Сваёй ідэяй рэжысёр падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды».**

— Мы хочам сабраць групу паломнікаў — каля 12 чалавек. Некаторыя з іх будуць вядомымі людзьмі — магчыма, Юрый Шаўчук або Валерый Залатухін. Нам патрэбны яркія і артыстычныя людзі, якія змогуць размаўляць адно з адным на камеру і прымаць рашэнні. Тым больш у жыцці часта бываюць моманты, калі чалавеку трэба выгаварыцца, выплюхнуць эмоцыі. Бывае так, што чалавеку патрэбна публічная споведзь. Адна з адметнасцяў фільма — непасрэдны ўдзел у ім рэжысёра і аператара, чаго дагэтуль ніколі не было.



Фота Мікалая КУКСАЧОВА.

***— У чым сутнасць будучага фільма?***

— Будзе выбраны маршрут з прыпынкамі. Калі сярод удзельнікаў спявак — ён можа дзесьці даць канцэрт, акцёр — таксама дзе-небудзь выступіць. Ці, скажам, будуецца храм — трэба спыніцца і некалькі дзён папрацаваць. На працягу ўсёй паездкі паломнікі паспрабуюць зразумець, дзе ў іх жыцці закладзена Божая воля, чаму Бог сабраў іх тут разам. Задача, вядома, не зусім сціплая. Але яна, зразумела, і не будзе аб'яўляцца. Першапачаткова мы планавалі, што паломнікі будуць ехаць на аўтобусе, сёння мы змянілі месца — героі фільма будуць падарожнічаць на караблі «Афон» — мы ўжо атрымалі дазвол на здымкі.

***— Ці плануецца ў праекце святар?***

— Я думаю, калі мы будзем спыняцца ў храмах і прыходах, сустрэчы са святарамі, безумоўна, будуць. Але ў самой групе, верагодна, не: калі будзе святар, то можа ўзнікнуць пэўнае духоўнае нераўнапраўе.

***— На які час запланаваны здымкі?***

— Я бяруся за яго рэалізацыю адразу, як вярнуся з гэтага фестывалю. Увесь гэты час ішла падрыхтоўка. Фільм запланаваны ў жанры духоўнай прыгоды, а не рэаліці-шоу, як меркавалі раней. Гэта новы жанр — вострасюжэтны, у фільме ўсё настолькі непрадказальна, што ў пачатку не ведаеш, што ўбачыш у канцы.

***— Ці ёсць у ідэі натхняльнік?***

— І так, і не. Так атрымалася, што прыдумлялі праект мы разам з манахам Бораўска-Пафнуцьеўскага манастыра. Там ёсць паслушнік Андрэй. Яго ідэя з паломнікамі была цалкам падобная да маёй — гэта сведчыць аб тым, што ідэя не новая і даўно лунае ў паветры. Насамрэч, прыадкрыць Божую волю з дапамогай кінематографа — у гэтым няма нічога асаблівага. Для чалавека гэта нармальна — увесь час спрабаваць спазнаць неспазнанае, знайсці адказы на пытанні, якія яго хвалююць. У гэтым сэнсе кінематограф і ёсць — самы што ні ёсць хрысціянскі.

**Ілья ЛАПАТО.**

# У гарадах-спадарожніках умовы жыллёвага крэдытавання будуць больш спрыяльнымі, чым у сталіцы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак асноўныя траты пры ўзвядзенні жылля прыпадаюць на сабекошт будаўнічых матэрыялаў. Тут існуе пытанне, бо на прадпрыемствах, што належаць менавіта Мінбудархітэктуры, вырабляецца толькі каля 40 працэнтаў аб'ёмаў і найменняў з усіх будаўнічых матэрыялаў, што выкарыстоўваюцца ў жыллёвым сектары. На прадпрыемствах міністэрства ўведзены абмежаванні па рэнтабельнасці і выкарыстоўваюцца іншыя мерапрыемствы па стрымліванні цэн на будматэрыялы, аднак... Каля 60 працэнтаў будматэрыялаў вырабляецца на прадпрыемствах іншых ведамстваў, у тым ліку на мясцовых вытворчасцях камунальнай уласнасці. Там кошт на будматэрыялы ўжо павялічыўся даволі істотна. Менавіта таму непасрэдна на будпляцоўцы цэны павялічваюцца больш, чым прагназавалася. Што тычыцца жыллёвых аб'ектаў, на якіх заключаны дагаворы да 15 мая, то па іх дзейнічае адпаведная пастанова Мінбудархітэктуры, дзе вызначаны гранічныя ўзроўні цэнаўтварэння.

Па аб'ектах, на якіх будаўніцтва пачалося пазней, кошт павялічваецца ўжо з большай дынамікай. Казаць аб канкрэтных цэнах, якія будуць існаваць у жыллёвым будаўніцтве заўтра, вельмі праблематычна.

Спецыялісты падлічылі, што ў першым паўгоддзі кошт будаўніцтва квадратнага метра жылля з дзяржаўнай падтрымкай для чаргавікоў складаў 2 млн 100 тысяч рублёў. **Сёння жыллёвы квадрат для чаргавікоў каштуе ўжо больш за 3 млн рублёў.** Зразумела, што ў цяперашняй сітуацыі, услед за іншымі таварамі і паслугамі даражэць далей будзе і будаўніцтва. Цудаў не бывае. Запэўню толькі, што ў дзяржаўным сектары жыллёвага будаўніцтва павелічэнне цэн будзе адбывацца ў эканамічна-абгрунтаваных межах.

На свабодным рынку будаўніцтва жылля цяпер сустракаюцца нават завоблачныя цэны, калі жыллёвы квадрат прапануецца спажыўцам часам за 9—10 мільёнаў рублёў і нават больш.

***— На якой стадыі зараз рэалізацыя праекта па будаўніцтве гарадоў-спадарожнікаў вакол Мінска? Часовыя фінансавыя складанасці краіны не замарозяць гэтыя планы?***

— Гарады-спадарожнікі сталіцы будуць пабудаваны. Цяпер завяршаецца праектаванне гэтых жыллёвых аб'ектаў. Гарвыканкам сёлета плануе пачаць будаўніцтва жылля ў першую чаргу ў Смалявічах.

***— Ці існуе дастатковая колькасць жыхароў Мінска з уліку чаргавікоў, хто згодны змяніць мінскую «прапіску» на іншую — «спадарожнікавую»?***

— Мінгарвыканкам актыўна інфармуе насельніцтва, тлумачыць спрэчныя пытанні. Ёсць ахвотныя на такое жыллё, набор працягваецца. Аднак трэба разумець, што канчаткова кліенты па такім новым жыллі вызначацца тады, калі будуць мець дакладную інфармацыю. Трэба мець канкрэтны адрас шматпавярховага дома, яго канструктыўныя характарыстыкі. І галоўнае — колькі кватэры там будуць каштаваць.

***— На ваш погляд, квадратны метр жылля ў гарадах-спадарожніках будзе каштаваць столькі ж, як і ў Мінску, ці крыху даражэй?***

— Пры падліку сабекошту будаўніцтва жылля ў гарадах-спадарожніках існуе некалькі нюансаў. Цяпер разглядаецца пытанне крыніц фінансавання будаўніцтва інфраструктуры, якая павінна адпавядаць узроўню сталічнай. Па-другое, толькі за кошт дадатковых транспартных выдаткаў прывезці дом буйнапанэльных серый у Смалявічы будзе даражэй, чым пабудаваць падобнае жыллё ў Мінску.

Аднак для новых жыхароў будучых «спадарожнікаў» існуюць і плюсы. Гаворка ідзе аб захаванні льготнага крэдытавання ў памеры 3 працэнтаў гадавых у гарадах-спадарожніках з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек. Магчыма, што ў гэтым выпадку для мінчан-чаргавікоў будзе дзейнічаць крыху іншая сістэма ўліку жылой плошчы, якая нарміруецца для льготнага крэдытавання.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2НПЗ серии БЛ №0400534 считать недействительным. *УНП 101883943*

## Крымінал, здарэнні

### МАЁР КДК АСУДЖАНЫ ЗА ХАБАР

**Старшы інспектар па асабліва важных справах маёр упраўлення Дэпартамента па фінансавых расследаваннях Камітэта дзяржкантролю па Гродзенскай вобласці асуджаны за хабар, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе УКДБ па Гродзенскай вобласці.**

Загадзя ведаючы, што не зможа вырашыць спрэчнае пытанне аб праве ўласнасці на аб'екты нерухомай маёмасці, размешчаныя ў Гродзенскай вобласці, супрацоўнік КДК увёў у зман аднаго з жыхароў Мінска, паабяцаўшы вырашыць яго праблему за ганарар. За такія паслугі маёр атрымаў $3 тыс. Механізм праціпраўнай дзейнасці выкрыты супрацоўнікамі ўпраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці і прадстаўлены суду.

Суд прызнаў былога маёра УДФР КДК вінаватым у падбухторванні да дачы хабару, у завалоданні маёмасцю шляхам падману. Пры вынясенні прыгавору суд улічыў станоўчыя характарыстыкі абвінавачанага з месца работы і наяўнасць на ўтрыманні малалетніх дзяцей. Было назначана пакаранне — абмежаванне волі тэрмінам на 3 гады.

### КАЛІ КРАСЦІ — ДЫК КАМБАЙН

А калі ўдарыцца — дык у МАЗ. У вёсцы Мушына Мсціслаўскага раёна малады чалавек прыйшоў на працу да бацькі, які працуе вартаўніком на машынным двары. Незачыненая тэхніка, якую паставілі на рамонт, выклікала ў нецвярозага хлопца вялікае жаданне пакатацца — па вясковай вуліцы, ды на вялікай машыне. Адзін з механізатараў спрабаваў выцягнуць хулігана з кабіны, але не паспеў: камбайн сутыкнуўся з МАЗам, які стаяў пры дарозе. Як кажуць, трапіў у непрыемнасць двойчы: давядзецца адказаць і за ўгон, і за дарожна-транспартнае здарэнне.

### НЕЗНАЁМЕЦ НА «ХОНДЗЕ» ЎНАЧЫ

**Службовым становішчам скарыстаўся 22-гадовы супрацоўнік круглаcутачнай мыйкі ў Магілёве: ён памыў аўтамабіль і вырашыў за адным разам на ім пакатацца.**

Як паведамілі ў Магілёўскім УУС, маладому чалавеку даручылі позна ўвечары прывесці «Хонду» ў парадак, а потым перадаць ключы вартаўніку. Так усё і здарылася. Але потым мыйшчык папрасіў ключы яшчэ раз: маўляў, нешта трэба дарабіць. А 4-й гадзіне ночы на гарадской вуліцы аўтамабіль прыцягнуў увагу інспектараў ДАІ. Высветлілася, што ён не належыць вадзіцелю, які, дарэчы, аказаўся ў нецвярозым стане. Цяпер машыну вярнулі гаспадару, а малады чалавек можа адказаць за крадзеж транспартнага сродку зняволеннем да 5 гадоў.

**Алена КАЗЛОВА.**

Минский городской центр недвижимости

### ОТКАЗ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

УП «Минский городской центр недвижимости» извещает об отказе от проведения 03.10.2011 открытого аукциона по продаже здания специализированного для общественного питания (столовая) общей площадью 489 кв. м, инвентарный номер 500/С-42222, расположенного по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 168 (извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.09.2011).

**Телефон для справок: (017) 227 48 36.**

Футбол

# ШАНЦЫ НА ЕЎРА-2012 СТРАЧАНЫ...

**УСЯЛЯКІЯ надзеі трапіць на Еўра-2012 для беларускай зборнай былі страчаны ў аўторак увечары. Падапечныя Бернда Штанге пазбавіліся ўсіх шанцаў, прайграўшы і другі матч зборнай Босніі і Герцагавіны.**

За што суддзя выдаліў Цімафея Калачова, яшчэ доўга можна будзе абмяркоўваць спецыялістам і балельшчыкам, але для большасці з нас відавочна, што другая жоўтая картка нашаму паўабаронцу была надуманай. З 34-й хвіліны беларуская зборная засталася ў меншасці. Але гэта не надта дапамагло баснійцам: небяспечных момантаў у матчы — кот наплакаў. Матч так і скончыўся б унічыю, калі б не арбітр Марцін Аткінсан. Мы марылі, што ў перапынку ён перагледзіць эпізод з Калачовым, як і свае да яго адносіны, і, магчыма, нават пастараецца кампенсаваць нашай зборнай несправядлівую адсутнасць ключавога гульца. Але ўдосталь нараздаваўшы «гарчычнікаў» (беларусам іх было прад'яўлена 7), Аткінсан на 85-й хвіліне зноў дастаў чырвоную картку — для Аляксандра Мартыновіча. Застаўшыся ўдзевяцярых, наша зборная прапусціла мяч. 0:1 — такі сумны канец выезду ў Боснію, і 0:3 — такі сумарны вынік двухматчавага беларуска-баснійскага супрацьстаяння.

Відавочна, што з такой гульнёй нашай зборнай на Еўра-2012 мы выглядалі б зусім не фаварытамі, але і баснійцам з такім футболам там няма чаго рабіць. Розніца толькі ў тым, што мы туды не едзем, а баснійцы — хутчэй за ўсё так. Крыўдна, што ў хатнім матчы ўсё вырашыў эпізод з выпадковым пенальці, а на выездзе суддзейства ўвогуле не хочацца ўзгадваць.

Пасля матча Бернд Штанге даў зразумець, што ў адстаўку не збіраецца, і пахваліў каманду:

— Мы паказалі якасную гульню. У мяне няма прэтэнзій да футбалістаў. Нават да Калачова, хоць дзеянні арбітра каментаваць не буду. Пачатак быў з нашага боку нядрэнны, хоць і крыху нервовы. Але ў такім балельшчыцкім катле валодаць сабой складана. На жаль, у нас няма якаснай лаўкі запасных, таму пры дапамозе замен праблемна ўзмацніць гульню. Гэтым тлумачыцца такі позні выхад на поле свежых футбалістаў. Якія мае далейшыя планы? Гэта правакацыйнае пытанне. І нясвоечасовае, заявіў ён пасля матча.

Вынікі астатніх матчаў дня: Люксембург выйграў у Албаніі 2:1, Францыя і Румынія згулялі ўнічыю 0:0.

### Становішча ў групе:

1. Францыя — 17 ачкоў (пасля 8 матчаў)
2. Боснія і Герцагавіна — 16 (8)
3. Румынія — 12 (8)
4. **Беларусь** — 12 (9)
5. Албанія — 8 (8)
6. Люксембург — 4 (9).

Моладзевая зборная Беларусі ў аўторак праводзіла адборачны матч супраць футбалістаў «маладзёжкі» Германіі. Падапечныя Юрыя Шуканава таксама саступілі з лікам 0:1.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

*(Працяг тэмы на 5-й стар.)*

**Данная проектная декларация отменяет действие проектной декларации строительства панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в районе пересечения улиц Иркутской – Хабаровской, опубликованной в газете «Звязда» 02 июня 2011 г. (№ 101 (26974)).**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**строительства панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в районе пересечения улиц Иркутской – Хабаровской**

**Информация о Застройщике**

**Общество с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» (ООО «Витасанплюс»).**

**Место нахождения:** г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, помещение 9.

**Режим работы:** понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Государственная регистрация застройщика:** Общество с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 4 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038, в результате реорганизации путем преобразования Частного строительного унитарного предприятия «Витасанплюс», зарегистрированного решением Минского городского исполнительного комитета от 27 июля 2001 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, ООО «Витасанплюс» участие не принимало.

**Информация о проекте**

**Цель проекта:** строительство панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в районе пересечения улиц Иркутской – Хабаровской.

**Срок реализации проекта:** 3 квартал 2010 г. – 4 квартал 2011 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение № 460–15/10, выданное 15.06.2010 г. Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

**Местонахождение строящегося многоквартирного жилого дома:** г. Минск, район пересечения улиц Иркутской – Хабаровской.

**Характеристика строящегося многоквартирного жилого дома:** 19-этажный крупнопанельный односекционный жилой дом из конструкций серии М 111-90 ОАО «МАПИД». Количество квартир в доме – 132, в том числе: однокомнатных – 57 ед., двухкомнатных – 57 ед., трехкомнатных – 18 ед. Отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется. Наружная отделка – покрытие бетонных панелей защитно-полимерным составом ЗДПС, покраска акриловыми фасадными красками по грунтовке. Высота этажа – 2,8 м. В каждой квартире есть летние помещения – остекленные лоджии. В квартирах первого этажа запроектированы погреба под лоджиями, используемые в хозяйственных целях. В доме предусмотрен мусоропровод и два лифта грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Сети водопровода запроектированы из полиэтиленовых напорных труб, бытовой канализации – из канализационных поливинилхлоридных труб. Проектом предусматривается прокладка волоконно-оптического кабеля (ВОЛС) от оптического узла, расположенного по ул. Байкальской, 37 до жилого дома и установка приемника прямого канала «ГАММА – 11» и передатчика обратного канала. Въезд на территорию жилого дома принят с переулка Томского.

**Цены на объекты долевого строительства:**

однокомнатные квартиры – 9 500 000 рублей за 1 кв.м общей площади.

двухкомнатные квартиры – 9 500 000 рублей за 1 кв.м общей площади.

трехкомнатные квартиры – 9 500 000 рублей за 1 кв.м общей площади.

**Условия оплаты:** уплата цены договора производится дольщиком единовременно не позднее 3 (трех) календарных дней с момента подписания договора создания объекта долевого строительства. По соглашению сторон уплата цены договора также может быть произведена дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства**: 6 единиц.

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 02 сентября 2010 г. № 1997 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение горисполкома»;

свидетельство (удостоверение) № 500/727-4427 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 500000000002007417, расположенного по адресу: г. Минск, район пересечения улиц Иркутской – Хабаровской, площадь – 0,3848 га, назначение – земельный участок для строительства панельного многоэтажного жилого дома, составленного Республиканским унитарным предприятием «Минским городским агентством по государственной регистрации и земельному кадастру» 21 сентября 2010 г.;

свидетельство (удостоверение) № 500/727-4426 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 500000000002007416, расположенного по адресу: г. Минск, район пересечения улиц Иркутской – Хабаровской, площадь – 0,0588 га, назначение – земельный участок для строительства повысительной насосной станции № 2 (по генплану), составленного Республиканским унитарным предприятием «Минским городским агентством по государственной регистрации и земельному кадастру» 21 сентября 2010 г.

**Границы земельного участка:** улица Иркутская – улица Хабаровская – переулок Томский.

**Площадь земельного участка:** земельный участок для строительства панельного многоэтажного жилого дома – 0,3848 га, земельный участок для строительства повысительной насосной станции № 2 (по генплану) – 0,0588 га.

**Элементы благоустройства:** вся территория участка застройки благоустраивается и озеленяется. Пешеходные дорожки и тротуары выполняются из мелкоразмерной тротуарной бетонной плитки.

**Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме:** на первом этаже запроектированы помещение товарищества собственников и электрощитовая. Ниже отметки 0,000 м предусмотрены помещения ИТП, водомерной, пожарной насосной.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома, поступают в общую собственность дольщиков.

**Предполагаемый срок ввода многоквартирного жилого дома в эксплуатацию:** 4 квартал 2011 года.

**Договор генерального строительного подряда:** договор генподряда на строительство № 30/09–10 от 30.09.2010 г. заключен Застройщиком с Открытым акционерным обществом «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:** ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя Застройщика – ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, д. 7, офис 302 (тел.: 8 017 2 900 901, 8 029 1 907 901) или на сайте **vivainvest.by**

### НЕ КАЛАСКІ З ПОЛЯ ЗБІРАЦЬ

Цукровай кукурузай двое жыхароў вёскі Старажоўцы Жыткавіцкага раёна пачалі загружацца з самай раніцы. Далёка не прыйшлося хадзіць: поле з каштоўнай культурай знаходзіцца побач з населеным пунктам. Аднак 650 кг маісу ў іх было канфіскавана, бо пра крадзеж даведаўся кіраўнік гаспадаркі «Тураўшчына», які напісаў заяву ў міліцыю.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Общество с ограниченной ответственностью «Инсталл-Билдинг»**
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

| № лота | Наименование имущества | Место нахождения имущества | Собственник | Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС) | Задаток 5%, рублей (без учета НДС) |
|---|---|---|---|---|---|
| | ИМУЩЕСТВА (без учета НДС) | | | | |
| 1 | Здания контрольно-пропускного пункта, одноэтажное кирпичное, с инв. № 310/С-2009 общей площадью 18,1 м², площадь земельного участка 0,0402 га | г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, д. 91А | ООО «Инсталл-Билдинг» | 22 266 000 | 1 113 300 |
| 2 | Здание специализированное иного назначения, одноэтажное с каркасно-засыпными, кирпичными стенами, с инв. № 350/С-43198, общей площадью 114 м², доля в праве земельного участка 20/100, площадь земельного участка 0,1232 га | г. Гомель, ул. 5-я Техническая, 1а | ООО «Инсталл-Билдинг» | 66 087 000 | 3 304 350 |
| 3 | Mercedes-Benz – 310d – 1992 г.в. в разукомплектованном состоянии | г. Гомель, ул. 5-я Техническая, 1а | ООО «Инсталл-Билдинг» | 21 144 000 | 1 057 200 |
| 4 | Газ 2752 1 – 1999 г.в. в разукомплектованном состоянии | г. Гомель, ул. 5-я Техническая, 1а | ООО «Инсталл-Билдинг» | 5 503 000 | 275 150 |

Организатор торгов – ликвидационная комиссия ООО «Инсталл-Билдинг».

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется **до 19.09.2011 г. (включительно)** на р/с № 3012401232013 – текущий в белорусских рублях в ОАО «Приорбанк» г. Минск, РБ, МФО 153001749, ЦБУ 400, УНП 490421723.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола и возместить затраты на проведение торгов. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 19.09.2011 года** по адресу: г. Гомель, ул. Шилова, 2, ком. 2.

Дата, время, место проведения открытого аукциона **20.09.2011 года** в 14.00, г. Гомель, ул. Шилова, 2, ком. 2.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 655 33 68, или (80232) 60 51 31.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

### Организатор аукциона — Смиловичский сельский исполнительный комитет

| Местополож. земельного участка | Кадастровый номер | Площ. зем-го уч-ка, га | Характеристика расположенных на участке строений и инженерн. коммуникаций | Начальн. цена объекта в руб. | Сумма задатка, руб. | Сумма подлеж. возмещ. затрат на оформл. и регистр. участка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Минская обл., Червенский р-н, д. Корзуны, уч. № 125 | 625883504101000296 | 0,1450 | Участок свободен от застройки. Имеется электроснабжение, водопровод, наличие асфальтированного подъезда | 21 690 000 | 2 169 000 | 1 112 000 + затраты за размещение сведений в СМИ |
| Минская обл., Червенский р-н, д. Корзуны, уч. № 56 | 625003504101000300 | 0,1448 | Участок свободен от застройки. Имеется электроснабжение, водопровод, наличие асфальтированного подъезда | 21 660 000 | 2 166 000 | 1 105 000 + затраты за размещение сведений в СМИ |
| Минская обл., Червенский р-н, д. Корзуны, уч. № 20 | 625003504101000301 | 0,1450 | Участок свободен от застройки. Имеется электроснабжение, водопровод, наличие асфальтированного подъезда | 21 690 000 | 2 169 000 | 1 112 000 + затраты за размещение сведений в СМИ |
| Минская обл., Червенский р-н, д. Корзуны, уч. № 15 | 625883504101000299 | 0,1450 | Участок свободен от застройки. Имеется электроснабжение, водопровод, наличие асфальтированного подъезда | 21 690 000 | 2 169 000 | 1 119 160 + затраты за размещение сведений в СМИ |
| Минская обл., Червенский р-н, д. Корзуны, уч. № 4 | 625883504101000297 | 0,1500 | Участок свободен от застройки. Имеется электроснабжение, водопровод, наличие асфальтированного подъезда | 22 432 000 | 2 243 000 | 1 112 000 + затраты за размещение сведений в СМИ |

1. Аукцион состоится **10 октября 2011 года в 11.00** в здании Смиловичского поселкового исполнительного комитета по адресу: Минская область, Червенский район, г.п. Смиловичи, ул. М. Горького, 8.
2. Условия проведения аукциона — наличие не менее двух участников.
3. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 5%.
4. Для участия в аукционе граждане предоставляют в комиссию по проведению аукционов заявление; копию заверенного банком платежного документа о внесении задатка; документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица; доверенность, удостоверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).
5. Сумма задатка перечисляется в срок до 6 октября 2011 года на расчетный счет 3600632102707 Главного управления МФ РБ по Минской области, назначение платежа 04901, УНН 600008278, код 601, ЦБУ № 627, Фил. 500 Минского управления ОАО «Беларусбанк» г. Червень.
6. Победитель аукциона обязан:

оплатить в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона по оформлению и государственной регистрации создания земельного участка, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

7. Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельным участком путем выезда к месту нахождения этого участка.

Заявления на участие в аукционе принимаются с момента размещения извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Червенский район, г.п. Смиловичи, ул. М. Горького, 8, сельисполком, кабинеты 2, 3.

Прием заявлений заканчиваются **3 октября 2011 г.**

**Контактные телефоны: (8 01714) 53236, 53458, 51588.**

## О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

В г. Пружаны Брестской области 10 октября 2011 года в 14.30 в кабинете № 321 (малый зал) Пружанского райисполкома, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Пружаны, ул. Г. Ширмы, 17 проводится аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков для строительства объектов придорожного сервиса вдоль автомобильной дороги «Обход территории Национального парка «Беловежская пуща» на участке Песчатка–Свислочь».

**НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЮТСЯ СЛЕДУЮЩИЕ УЧАСТКИ:**

| Местонахождение участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Срок аренды, лет | Начальная цена, руб. | Расходы по проведению аукциона, руб. | Сумма задатка | Целевое назначение |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3,3 км юго-западнее г.п. Шерешево Шерешевского поссовета | 0,40 | 125600000001001308 | 50 | 1 641 600 | 1 645 374 | 164 160 | кафе на 50 мест, кемпинг, автостоянка |
| 0,7 км западнее дер. Броды Щерчовского сельсовета | 0,40 | 125600000001001307 | 50 | 410 400 | 1 647 901 | 41 040 | кафе на 50 мест, кемпинг, автостоянка |

Для участия в аукционе необходимо представить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602225000008 в центре банковских услуг № 122 филиала № 113 ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк», код 237, назначение платежа 4002, получатель платежа – райфинотдел, УНП 200141043.
3. Без нотариального засвидетельствования копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица, или копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Пружаны, ул. Г. Ширмы, 17, каб. 114 (землеустроительная служба) с 8.00 до 17.00 по рабочим дням до 4 октября включительно.

Кроме платы за право заключения договора аренды земельного участка, победитель возмещает расходы, связанные с проведением аукциона, расходы по публикации извещения в средствах массовой информации.

Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

**Контактный телефон в г. Пружаны 8 (01632) 91369.**

# НЕ «ПРАЦЭНТ», А ЯКАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Апроч пратаколаў, выдаюцца яшчэ і акты прадпісанняў, сутнасць якіх — папярэджанне. Парушальніку вызначаюць тэрмін, на працягу якога ён абавязаны выправіць сітуацыю. Актаў прадпісанняў, як правіла, выпісваецца ўдвая больш, чым пратаколаў, бо штраф для нас — не самамэта. Галоўнае — ліквідаваць наступствы парушэння заканадаўства. Іншая справа, калі парушальнік праігнараваў прадпісанне. У Адміністрацыйным кодэксе ёсць артыкул, які прадугледжвае за невыкананне акта прадпісання штраф да 20 базавых велічынь. Парушэнні бываюць розныя: адна справа, калі грамадзянін своечасова не прыбраў зваленыя на вуліцы дровы, і іншая, калі арганізацыя ЖКГ не ўпарадкуе належным чынам звалку плошчай 10 сотак. Адпаведна рознымі будуць і штрафныя санкцыі.

Па словах Аляксандра Віктаравіча, абследаванні паказалі, што найчасцей парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства выяўляюцца ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах. Менавіта на іх імя складаецца большая колькасць пратаколаў. Але ў апраўданне СВК трэба сказаць, што і патрабаванні прад'яўляюцца да іх па найбольш шырокаму спектру (стан жывёлагадоўчых комплексаў, кар'ераў, вяртанне земляў у сельгасзварот, абыходжанне з адходамі і інш.) Што тычыцца арганізацый ЖКГ, тут найбольш заўваг у кантралюючых органаў выклікае якасць працы па ўтрыманні міні-палігонаў.

У канцы мая гэтага года Мінаблвыканкам прыняў новыя патрабаванні да добраўпарадкавання індывідуальных жылых забудоў на тэрыторыі Мінскай вобласці, у якіх адлюстраваны абавязкі па навядзенні парадку на зямлі як органаў улады, так і саміх жыхароў. Неабходнасць у іх прыняцці наспела даўно, пацвердзіў Аляксандр Дабрыцкі, бо ранейшыя патрабаванні да добраўпарадкавання населеных пунктаў састарэлі. Цяпер на падыходзе новыя — рэспубліканскія — правілы, у аснову якіх пакладзены распрацоўкі Міншчыны.

— Сёння падчас абследаванняў мы бачым, што дваровыя тэрыторыі аператыўна вызваляюцца ад прывезеных і зваленых дроў, сена людзі цяпер стараюцца складваць не за агароджай, а ў двары. Ёсць станоўчыя зрухі і ў плане абкошвання сваёй прыдваравой тэрыторыі. З прыняццем адзіных абласных патрабаванняў вяскоўцы сталі больш адказнымі ў плане добраўпарадкавання.

Прааналізаваўшы вынікі паўгадавых абследаванняў спецыялістамі абласнога камітэта і раённых інспекцый, працу па навядзенні парадку на зямлі на Міншчыне Аляксандр Віктаравіч ацаніў як вартую.

— Калі браць працэнт выканання ад запланаваных заданняў, то гэта больш за 90 працэнтаў. Іншая справа — якасць. Як паказваюць нашы абследаванні, не заўсёды тое, пра што даюць справаздачу мясцовыя ўлады, на самай справе выконваецца якасна. Хоць, зразумела, у многім недапрацоўкі абумоўлены няпростай фінансавай сітуацыяй.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

## ...і пяць мільёнаў кветак

У апошнія гады асаблівая ўвага ў плане добраўпарадкавання надаецца знешняму выгляду сельскіх населеных пунктаў, азеляненню і кветкаваму афармленню тэрыторыі вёсак і пасёлкаў. Толькі за 7 месяцаў гэтага года жыллёва-камунальнымі службамі Мінскай вобласці ў населеных пунктах пасаджана больш за 63 тыс. дрэў, 45 тыс. кустоў, звыш 5 млн кветак, разбіта больш за 70 га газонаў, створана 566 дэкаратыўных кампазіцый (альпійскіх горак, ракарыяў і інш.), праведзена комплекснае добраўпарадкаванне 179 дваровых тэрыторый, а таксама тэрыторый 39 паркаў і бульвараў, упарадкавана 55 сквераў, афармлены 132 уезды ў населеныя пункты, выкананы работы па паляпшэнні 280 км дарожнага пакрыцця і ўстаноўцы 86 км новых агароджаў на вуліцах населеных пунктаў, адноўлена, заменена і адрамантавана 311 агароджаў на могілках, уведзена 515 км новых сетак вонкавага асвятлення, адноўлены дзейныя сеткі, у зонах масавага адпачынку абсталявана 90 гульнявых і спартыўных пляцовак, устаноўлена звыш 400 кантэйнераў для раздзельнага збору смецця.



# «АДКРЫТАЯ ПЛЯЦОЎКА» ПАД ПУНСОВЫМІ ВЕТРАЗЯМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Сёлета 75 працэнтаў выпускнікоў школы паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, прычым пераважна на бюджэтную форму навучання. Падчас цэнтралізаванага тэсціравання па шэрагу прадметаў яны прадэманстравалі ўзровень ведаў, вышэйшы за сярэдні па раёне і нават па вобласці. У іх «актыве» — 96 балаў па рускай мове, 92 балы — па беларускай і столькі ж — па матэматыцы... Каб стымуляваць дзяцей да такіх вынікаў, у школе створана сістэма, паводле якой, акрамя спаборніцтваў паміж класамі і асобнымі вучнямі, існуе спаборніцтва кожнага... з самім сабой. У канцы года ты параўноўваеш свае цяперашнія вынікі з папярэднімі і робіш адпаведныя высновы.

— Не можа «сярэдні» вучань спаборнічаць з моцным, а вось перагнаць самога сябе — можа. Мы такія памкненні дзяцей заўважаем і стымулюем — маральна і матэрыяльна, выплочваючы спецыяльныя стыпендыі за дасягненні ў вучобе і пазашкольнай працы. Грошы на гэта ні ў каго не просім — бяром са сваіх, зробленых.

Сістэма маральнага і матэрыяльнага стымулявання датычыцца не толькі вучняў, а і настаўнікаў. Пасля ўдзелу ў рэспубліканскай нарадзе педагагічнага актыву Гружэўскі сабраў свой педсавет. Гаварылі шмат пра што, у тым ліку не абмінулі тэму прэстыжу прафесіі, у прыватнасці, залежнасць гэтага самага прэстыжу ад заработнай платы.

— Можна даць аднаму ці, скажам, пяці настаўнікам зарплату, эквівалентную 2 тысячам долараў — і што, назаўтра ўзрасце прэстыж прафесіі? Сумняваюся. Рост зарплаты можа хіба толькі падштурхнуць абітурыентаў да паступлення ў педагагічныя ВНУ. Але не факт, што тыя, хто паступіць туды з высокімі баламі, узнімуць прэстыж прафесіі, — разважае Міхаіл Мар'янавіч. — Я памятаю сваю вясковую школу ўзору 60-х — сяляне заўсёды здымалі перад настаўнікам шапку, хоць зарплата ў яго была 45 рублёў... Прэстыж прафесіі залежыць не ад зарплаты, а ад асобы настаўніка, ад таго, як ён працуе з дзецьмі, якія веды дае... І калі прэстыж «захістаўся», гэта ў многім віна саміх настаўнікаў.

Сумных, нецікавых прадметаў, упэўнены Міхаіл Гружэўскі, не бывае — бываюць сумныя, нецікавыя педагогі. І вучні ў школе «любяць» ці «не любяць» не прадмет, а таго, хто яго выкладае. А захапіць сваім прадметам можа толькі той, хто захоплены сам.

— Кожны, хто ідзе працаваць у школу, павінен разумець, што ў нейкім сэнсе гэта ўжо самаахвяраванне, — кажа Міхаіл Мар'янавіч. — І што багатым ён не будзе ніколі, нават у самыя стабільныя эканамічныя часы.

Самому спадару Гружэўскаму неаднойчы прапаноўвалі пасады і партфелі рознага кшталту. Але ён пагадзіўся толькі на грамадскую нагрузку — другі тэрмін запар з'яўляецца дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета, намеснікам старшыні камісіі па сацыяльных пытаннях. Сцвярджае, што гэта дапамагае ўсталёўваць новыя прафесійныя і дзелавыя кантакты, якія можна выкарыстоўваць у інтарэсах роднай навучальнай установы.

Міхаіл Мар'янавіч выдае мне «сакрэт» добрай школы: гэта месца, дзе дзіця адчувае сябе ў бяспецы. А значыць, там павінны панаваць дысцыпліна і парадак. Не ў сэнсе «на першы-другі разлічыся!», а нармальная падпарадкаванасць існуючым правілам і патрабаванням: не спазняцца, рыхтавацца да заняткаў, не перашкаджаць іншым...

Добрая школа, дадае ён, тая, якой ганарацца і дзеці, і дарослыя, дзе паважаюць традыцыі, дзе не страчваюць сувязь з выпускнікамі, дзе бацькам дазваляюць прысутнічаць на ўроках. Дзе ўвесь час імкнуцца да новага і цэняць тое, што ёсць.

...Безумоўна, я не магу не ўзгадаць пра пунсовыя ветразі. Ідэя, некалі ўпершыню ўвасобленая ў жыццё настаўнікамі і вучнямі Ашмянскай СШ № 1, разышлася па ўсёй краіне, і сёння ў розных яе кутках на прышкольных тэрыторыях можна ўбачыць караблі пад пунсовымі ветразямі, тымі самымі, якія даўно сталі сімвалам летуценнасці, надзеі і светлых памкненняў.

— А нам не шкада! — усміхаецца Гружэўскі. — Школа заўсёды была і застаецца «адкрытай пляцоўкай», і ў нас ні ад каго няма ніякіх сакрэтаў.

**Наталля КАРПЕНКА.**

*Ашмянскі раён.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕНОСТЬ В г. ЛИДА

**Аукцион состоится в 14.00 12 октября 2011 г. в г. Лида Гродненской обл. по ул. Советской, 8.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 11 октября 2011 г. до 15.00.**
**Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», дополнительная информация: www.ino.by**

| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Лида, пер. Угловой, 5 441300000013000002 | г. Лида, ул. 4-я Хасановская, У-147 423650100011001233 | г. Лида, ул. Пригородная, 15 441300000002000397 | г. Лида, ул. Царюка, 48 423650100010000286 | г. Лида, ул. Народная, 48 441300000013000083 | г. Лида, ул. Аэродромная, 40 423650100013001727 |
| Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| Право на земельный участок | Право частной собственности | Право частной собственности | Право частной собственности | Право частной собственности | Право частной собственности | Право частной собственности |
| Площадь, га | 0,1026 | 0,1386 | 0,1321 | 0,12 | 0,1023 | 0,1017 |
| Форма участка | Прямоугольная | Четырехугольная | Четырехугольная | Прямоугольная | Четырехугольная | Прямоугольная |
| Рельеф участка | Равнинный | Равнинный | Равнинный | Равнинный | Равнинный | Равнинный |
| Расположение земельного участка | Юго-восточная часть города | Южная часть города | Северная часть города | Центральная часть города | Юго-восточная часть города | Юго-восточная часть города |
| Расположение участка в массиве застройки | Не угловой | Не угловой | Не угловой | Угловой | Не угловой | Не угловой |
| Транспортная доступность | Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Малахова, автобусы №№ 5, 6, приблизительно составляет 1600 м. | Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. 1-я Хасановская, автобус № 11, приблизительно составляет 600 м. | Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Сосновая, автобус № 3, приблизительно составляет 800 м. | Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Коммунистическая, автобусы №№ 5, 8, 10, 11, приблизительно составляет 100 м. | Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Малахова, автобусы №№ 5, 6 приблизительно составляет 1500 м. | Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Малахова, автобусы №№ 5, 6, приблизительно составляет 900 м. |
| Инженерная инфраструктура | — | — | — | — | — | — |
| Экологическое состояние | Благоприятное | Благоприятное | Благоприятное | Благоприятное | Благоприятное | Благоприятное |
| Наименование ограничений в праве | НЕТ | НЕТ | Площадью 0,0006 га в охранных зонах линий электропередачи | НЕТ | НЕТ | НЕТ |
| Начальная цена земельного участка, руб. | 19 804 878 | 42 243 007 | 35 160 066 | 47 671 536 | 19 735 061 | 38 834 104 |
| Задаток, руб. | 1 980 490 | 4 224 300 | 3 516 000 | 4 767 150 | 1 973 500 | 3 883 410 |
| Дополнительное условие | Победителю аукциона возместить: - за государственную регистрацию прекращения прав на земельный участок 70,0 тыс. рублей. | Победителю аукциона возместить: - за государственную регистрацию прекращения прав на земельный участок 84,0 тыс. рублей. | Победителю аукциона возместить: - за государственную регистрацию прекращения прав на земельный участок 23 470 рублей. | Победителю аукциона возместить: - за государственную регистрацию прекращения прав на земельный участок 84,0 тыс. рублей. | Победителю аукциона возместить: - за государственную регистрацию прекращения прав на земельный участок 84,0 тыс. рублей. | Победителю аукциона возместить: - за государственную регистрацию прекращения прав на земельный участок 84,0 тыс. рублей. |

Внесение победителем аукциона платы за земельный участок;

возмещение победителем аукциона расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона;

осуществление победителем аукциона в двухмесячный срок, после получения выписки из решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

согласование проекта и оформление паспорта застройщика на строительство жилого дома в управлении архитектуры и строительства райисполкома до начала строительства;

занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации прав на него.

Условия аукциона:

к участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявление в соответствии с действующим законодательством.

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь.

Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 5%.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;

копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или доверенного лица;

доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

**Продавец – Лидский районный исполнительный комитет. Организатор – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**Аукцион состоится в 11.00 12 октября 2011 г. в г. Лиде Гродненской обл по ул. Советской, 8. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 11 октября 2011 г. до 15.00.**
**Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by**

| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Лида, ул. Свердлова, У-81 423650100002000755 | г. Лида, ул. Строителей, У-70 423650100003000968 | г. Лида, ул. Центральная, У-82 423650100013001823 | г. Лида, ул. Красноармейская, У-779 423650100005000930 | г. Лида, ул. Свердлова, У-69 423650100005000844 | г. Лида, ул. Сосновая, У-777 423650100002000893 | г. Лида, ул. Невского, У-704 423650100006000960 | г. Лида, ул. Крупской 42365010000732 | г. Лида, ул. Чехова, У-778 423650100005000929 |
| Целевое назначение земельного участка | Для строительства пункта технического обслуживания легковых автомобилей с автомоечным комплексом | Для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров с кафетерием | Для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров | Для строительства пункта по оказанию страховых услуг | Для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров с кафетерием | Для строительства торгового павильона с остановочным навесом | Для строительства стоянки большегрузных машин | Для строительства станции технического обслуживания | Для строительства магазина непродовольственных товаров |
| Срок аренды | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 10 лет |
| Площадь, га | 0,5536 | 0,2616 | 0,3000 | 0,0015 | 0,2024 | 0,0078 | 0,7563 | 1,9836 | 0,0384 |
| Форма участка | четырехугольная | четырехугольная | неправильная | четырехугольная | четырехугольная | четырехугольная | четырехугольная | неправильная | трапеция |
| Рельеф участка | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный | равнинный |
| Расположение земельного участка | Северная часть города | Северно-западная часть города | Восточная часть города | Западная часть города | Северно-восточная часть города | Северная часть города | Западная часть города | Западная часть города | Северная часть города |
| Расположение участка в массиве застройки | угловой | угловой | угловой | Не угловой | угловой | не в массиве застройки | угловой | угловой | угловой |
| Транспортная доступность | Расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Притыцкого (автобус № 3) приблизительно составляет 350 м | Расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Строителей (автобус № 7) приблизительно составляет 10 м | Расстояние: до ближаейшей остановки городского транспорта по ул. Малахова (автобусы №№ 5,6) приблизительно составляет 900 м | Расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Красноармейская (автобусы №№ 1, 2, 6, 7, 7а, 8, 9, 12) приблизительно составляет 50 м | Расстояние: до ближаейшей остановки городского транспорта по ул. Свердлова (автобус № 3) приблизительно составляет 100 м | Расположен на конечной остановке городского автобуса № 3 | Расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Куйбышева (автобус № 8, по ул. Крупской автобус № 2) приблизительно составляет 1500 м | Расстояние: до ближайшей остановки городского транспорта по ул. Рыбиновского (автобусы №№ 1, 6, 9, 12) приблизительно составляет 1000 м | Расстояние: до ближаейшей остановки городского транспорта по ул. Свердлова (автобус № 3) приблизительно составляет 300 м |
| Инженерная инфраструктура | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество (вероятно строительство трансформаторной подстанции), канализация (очистка сточных вод на местных очистных), водопровод (в случае попадания под пятно застройки необходима выноска), теплосети, газ с условиями. | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод с условиями. | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество (необходимо строительство трансформаторной подстанции), газ с условиями. | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество с условиями. | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод, канализация (существует самотечный канализационный коллектор) с условиями. | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, водопровод, канализация с условиями. | Существует возможность подключения к городским сетям: водопровод, электричество, теплосети, газопровод с условиями, в связи с отсутствием центральной канализации сброс сточных вод предусмотреть в изолированный септик, при условии согласования с Лидским райЦГЭ. | Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, водопровод, канализация, тепловые сети, газ с условиями. | Существует возможность подключения к городским сетям: газопровод, теплосети, электричество, водопровод, канализация с условиями. |
